МАЙСТЭРНЯ НАСТАЎНІКА

Т. Ю. Аброськіна

# Асновы моўнай культуры

## 4 клас

*Планы-канспекты па факультатыўным курсе для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі*

Мінск
«Сэр-Віт»
2024

# ПАВАЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ!

Прапаную вам распрацоўкі, якія дапамогуць эфектыўна праводзіць факультатыўныя заняткі «Асновы моўнай культуры» ў 4-м класе.

Вучэбная праграма скіроўвае настаўнікаў да пашырэння ведаў вучняў элементарнымі звесткамі пра планету Зямля, пра чалавека як асобу.

У распрацоўкі факультатыўных заняткаў уключаны лексіка-граматычны матэрыял, актуальны для камунікатыўнай дзейнасці ў адпаведнасці з прапанаванымі тэмамі. Гэты матэрыял прадстаўлены творамі беларускай дзіцячай літаратуры і народнай спадчынай, вытрымкамі з навукова-папулярнай і даведачнай літаратуры.

Заданні скіраваны на развіццё ўменняў вучняў прагназаваць змест твора па загалоўку, ілюстрацыях і апорных словах; аналізаваць твор па тэкставых заданнях; складаць уласнае выказванне, будаваць яго ў пэўнай лагічнай паслядоўнасці; праводзіць адбор неабходных моўных сродкаў; ярка перадаваць лагічны і эмацыянальны змест выказвання, прымаць удзел у гутарцы; разумець сэнс устойлівых словазлучэнняў, свядома выкарыстоўваць іх у моўнай практыцы; рыхтаваць паведамленне на дадзеную тэму; весці дыялог і аргументаваць свае меркаванні.

Падабраны матэрыял мае вялікі выхаваўчы патэнцыял, прызваны заклікаць вучняў да праяўлення станоўчых якасцяў характару: адказнасці, працалюбства, любові да сваёй сям'і і да Радзімы, ушанавання яе гістарычнага мінулага. Матэрыял заняткаў скіроўвае вучняў да неабходнасці свядомага выбару прафесіі, працы на карысць сваёй краіны. Таксама ёсць цікавыя заданні для фарміравання функцыянальнай граматнасці вучняў.

***Жадаю поспеху вам і вашым вучням!***

# Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

| № п/п | Тэма занятку | Дата |
|---|---|---|
| | **З роднай мовай па планеце** | |
| 1 | Сонца і Сонечная сістэма | |
| 2 | Планета Зямля | |
| 3 | Месяц – спадарожнік Зямлі | |
| 4 | Водныя прасторы: акіяны | |
| 5 | Водныя прасторы: моры | |
| 6 | Найвялікшыя рэкі планеты | |
| 7 | Горы | |
| 8 | Пустыні | |
| 9 | Вандруем па планеце. Старажытная Еўропа | |
| 10 | Вандруем па планеце. Такая розная Афрыка | |
| 11 | Вандруем па планеце. Паўночная Амерыка | |
| 12 | Вандруем па планеце. Паўднёвая Амерыка | |
| 13 | Вандруем па планеце. Краіны Блізкага і Сярэняга Усходу | |
| 14 | Вандруем па планеце. Краіны Дальняга Усходу | |
| 15 | Вандруем па планеце. Загадкавая Аўстралія | |
| 16 | Вандруем па планеце. Антарктыда | |
| 17 | Абагульняючыя заняткі. Вандруем па планеце | |

| № п/п | Тэма занятку | Дата |
|---|---|---|
| **Я – чалавек** | | |
| 18 | Чалавек і яго пачуцці: радасць, любоў | |
| 19 | Чалавек і яго пачуцці: гора, нянавісць | |
| 20 | Чалавек і яго якасці: дабрыня, шчодрасць, міласэрнасць | |
| 21 | Чалавек і яго якасці: смеласць | |
| 22 | Чалавек і яго якасці: эгаізм | |
| 23 | Чалавек і яго блізкія: бацькі | |
| 24 | Чалавек і яго блізкія: бабуля і дзядуля | |
| 25 | Чалавек і яго блізкія: браты, сёстры | |
| 26 | Чалавек і яго блізкія: сябры | |
| 27 | Чалавек і яго справы. Дасягненні чалавека ў навуцы, тэхніцы | |
| 28 | Чалавек і яго справы. Дасягненні чалавека ў літаратуры | |
| 29 | Чалавек і яго справы. Дасягненні чалавека ў мастацтве | |
| 30 | Чалавек і яго справы. Дасягненні чалавека ў спорце | |
| 31 | Чалавек і яго мары | |
| 32 | Быць чалавекам. Выбар прафесіі | |
| 33 | Выбар прафесіі | |
| 34 | Знакамітыя людзі свету. Што я хачу зрабіць для Беларусі | |
| 35 | Абагульняючыя заняткі. Я – чалавек | |

# З РОДНАЙ МОВАЙ ПА ПЛАНЕЦЕ

## *Тэма 1.* Сонца і Сонечная сістэма

***Мэты:*** ствараць умовы для папаўнення ведаў вучняў лексікай, неабходнай для пабудовы выказванняў, звязаных з Сонечнай сістэмай; развіваць уменне ствараць звязныя выказванні па тэме; выхоўваць цікавасць да вывучэння нябесных свяціл.

***Абсталяванне:*** прадметныя малюнкі ці прэзентацыя з выявамі прафесій людзей.

### Ход занятку

**I. Арганізацыйны этап**

Настаўнік стварае пазітыўны настрой з дапамогай вывучанай у 3-м класе вершаванкі:

Вось званок звініць заўзята,
Кліча дзетак на занияткі,
На заняткі пазітыўныя,
Не звычайныя, а факультатыўныя.

**II. Этап падрыхтоўкі да актыўнага і свядомага засваення ведаў**

Праводзіцца гутарка аб тым, на якой мове вучні вось ужо некалькі гадаў запар размаўляюць на факультатыўных занятках «Асновы моўнай культуры». Пра людзей якіх прафесій размаўлялі ў мінулым вучэбным годзе? Каб успомніць гэта, прапануецца **гульня «Чый гэта выраб?»** Настаўнік называе тры вырабы майстра, а вучні павінны назваць прафесію чалавека. Гульню можна ілюстраваць з дапамогай прэзентацыі ці пагартаць рабочы сшытак для 3-га класа.

- **Серп, падкова, тапор** ... каваль
- **Карункі, рукавіцы, шкарпэткі** ... вязальшчыца
- **Пасталы, поршні, чаравікі** ... шавец
- **Булка, пірог, бублік** ... пекар
- **Кадка, бочка, дзежка** ... бондар

Робіцца абагульненне, пра якія прафесіі нашых продкаў, а таксама сучаснікаў вучні даведаліся ў мінулым годзе.

Прапануецца адгадаць загадкі:

- Кругленька, залаценька, усяму свету міленька. *(Сонца.)*
- Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, а другое – уночы? *(Сонца і месяц.)*

Паведамляецца, што у гэтым годзе вучні будуць пашыраць свой слоўнікавы запас, размаўляючы пра Сонечную сістэму, а таксама пра розныя часткі свету; будуць абмяркоўваць розныя якасці чалавека, чытаць шматлікія творы беларускіх пісьменнікаў на гэтыя тэмы, а таксама навукова-папулярныя артыкулы.

**III. Этап засваення новых ведаў**

Настаўнік прапануе разгледзець у рабочым сшытку ілюстрацыю Сонечнай сістэмы і выказаць прапановы, пра што даведаюцца на сённяшнім занятку.

***Заданне 1*** (с. 4). Трэба на ілюстрацыі знайсці Сонца і назваць планеты Сонечнай сістэмы.

– У якім парадку планеты размешчаны адносна Сонца?
– Чаму ў загадцы гаворыцца, што Сонца міла ўсяму свету?

*Слова настаўніка*

Мы жывём на адной з васьмі планет, якія рухаюцца вакол Сонца. Зямля – адзіная планета, на якой ёсць жыццё. На іншых планетах няма ўмоў для жыцця: паветра, падыходзячай тэмпературы для існавання жывых арганізмаў. Нашы продкі разумелі, якое значэнне мае Сонца для жыцця на Зямлі. Яны пакланяліся богу Сонца, яго называлі Дажбог ці Ярыла. Князі, каб замацаваць сваю ўладу, называлі сябе нашчадкамі бога Сонца. Розныя вераванні і традыцыі беларусаў звязаны з Сонцам.

– Якое беларускае традыцыйнае свята суправаджаецца выпечкай бліноў – вобраза Сонца? *(Масленіца.)*

***Заданне 2*** (с. 4). Прапануецца паслухаць артыкул у рабочым сшытку і адказаць на пытанні:

– Якая тэмпература на Сонцы?
– Што было б, калі б Сонца згасла?

Вучні адказваюць на пытанні, пастаўленыя перад чытаннем, і самастойна знаёмяцца з артыкулам. Настаўнік прапануе скласці 2–3 пытанні па артыкуле і задаць іх таварышам. Пасля праводзіцца гутарка па пастаўленых вучнямі пытаннях. Калі пытанні аднатыпныя, настаўнік карэкціруе іх.

***Фізкультхвілінка***

Сонца спіць, неба спіць, *(Вучні сядзяць на кукішках.)*
Нават вецер не шуміць. *(Далонькі пад галавою, вочы заплюшчаны.)*

1. На касмічнай ракеце шлях да Месяца складае:

- [ ] некалькі гадзін
- [+] некалькі дзён
- [ ] некалькі месяцаў

2. На месяцы не можа быць жыцця, таму што:

- [ ] яго паверхня награваецца Сонцам да 130 градусаў
- [ ] там няма вады
- [+] там няма атмасферы

3. Месяц па велічыні і па масе:

- [ ] больш за Зямлю
- [ ] такі самы, як Зямля
- [+] меншы за Зямлю

4. Усе прадметы там:

- [ ] цяжэй у 6 разоў
- [+] лягчэй у 6 разоў
- [ ] цяжэй на 6 кілаграмаў

5. Месяц складаецца з:

[ ] кары і мантыі [ ] мантыі і ядра [+] кары, мантыі і ядра

Потым праводзіцца ўзаемаправерка.

***Заданне 5*** (с. 8). Вучні ў рабочым сшытку чытаюць верш Леаніда Шырына «Месяц». Настаўнік прапаноўвае вывучыць яго на памяць.

**IV. Этап абагульнення ведаў**

– Якія яшчэ назвы мае слова «Месяц»?
– У якіх выпадках ён называецца па-іншаму?
– Якія звесткі пра Месяц найбольш зацікавілі?

*Вучні ацэньваюць сваю работу з дапамогай смайлікаў.*

## Ход занятку

**I. Арганізацыйны этап**

Ура! Прыйшоў жаданы час –
І вось заняткі ўжо ў нас.
Моўнай культуры асновы мы вывучаем,
Новыя веды аб свеце цяпер набываем.

**II. Этап падрыхтоўкі да актыўнага і свядомага засваення ведаў**

Настаўнік прапаноўвае **гульню «Якая дзяржава лішняя»**. Ён пералічвае назвы афрыканскіх краін, а вучні пляскаюць у далоні тады, калі названа не тая краіна.

Намібія, Танзанія, Эфіопія, Францыя, Мадагаскар, Алжыр, Марока, Данія, Туніс, Егіпет.

– Назавіце жывёл Афрыкі.
– Чаму Афрыку называюць запаведнікам для жывёл?

Прапануецца паўтарыць скорагаворку Міхася Пазнякова.
Гаворыць Рыгорка шпаркай гаворкай.
Паправім Рыгорку: шпарка гаворыць.

**III. Этап засваення новых ведаў**

– Каб даведацца, пра які кантынент пойдзе гутарка, прачытайце часткі слоў, выдзеленыя адным колерам (размешчана на дошцы):

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Паў | Аме | ноч | ры | на | ка | я |

Прапануецца разгледзець гэты кантынент на ілюстрацыі карты (с. 20) у рабочым сшытку.

Далей настаўнік знаёміць вучняў са значэннямі новых слоў.

***Слоўнікавая работа*** (словы запісаны на дошцы)

*Іглу* – традыцыйнае жытло эскімосаў; вышыня – 2 метры, у яго аснове – снег.

*Вігвам* – купалападобны дом індзейцаў Паўночнай Амерыкі з вецця, кары і скур.

*Рэзервацыя* – тэрыторыі, дзе жывуць карэнныя жыхары Амерыкі, індзейцы (рэзервацыі ёсць у Аўстраліі і ПАР).

*На́час* – чыпсы з кукурузнай мукі.

*Тарцілья* – хлеб з кукурузнай мукі.

*Слова настаўніка*

Паўночную Амерыку называюць мацерыком кантрастаў. Тут размешчаны такія краіны, як Канада, ЗША (Злучаныя Штаты Амерыкі), Мексіка, Грэнландыя, Канадскі Арктычны архіпелаг, Карыбскія астравы, Цэнтральная Амерыка, Куба. І ўсе яны маюць выхад да мора.

Амерыку адкрыў Хрыстафор Калумб, які ў XV стагоддзі накіраваўся на пошукі багатай Індыі. Калумб да канца жыцця верыў, што знайшоў берагі Індыі. У той час ніхто не верыў, што Зямля мае форму шара. Людзі думалі, што спусціцца ў другое паўшар'е немагчыма, бо будуць перашкаджаць «вадзяныя горы, якія ўтвараюць выпукласць шара».

На самай поўначы гэтага мацерыка жывуць эскімосы. Яны будуюць *іглу* – традыцыйнае паўночнае жытло вышынёй 2 метры. У некаторых іглу нават няма вокнаў (прапануецца разгледзець ілюстрацыю іглу ў рабочым сшытку на с. 24).

Калі кажуць пра народы Амерыкі, то часцей успамінаюць індзейцаў. Але гэта не адзін народ. Зараз вядома каля тысячы плямёнаў. Традыцыйны дом індзейцаў – *вігвам*. Карэнныя амерыканцы (індзейцы) зараз жывуць у *рэзервацыях*. Вядома, што такія плямёны, як мая і ацтэкі, у XV стагоддзі мелі сваю пісьменнасць, будавалі піраміды.

Ацтэкі першыя сталі апрацоўваць какава-бабы, яны гатавалі «напой багоў»: залівалі какаву гарачай вадой і дадавалі крышку перцу чылі. Зараз з гэтым перцам ядуць усе супы, кашы і дэсерты ў Мексіцы. Гэта дзяржава зараз размешчана на землях ацтэкаў.

Таксама з часоў ацтэкаў да нас дайшла *кукуруза*, яе другая назва – *маіс*. З яе робяць кукурузны хлеб – *тарцілью*, робяць чыпсы, якія называюцца *на́час*.

Вялікай і шматнацыянальнай дзяржавай Паўночнай Амерыкі з'яўляюцца Злучаныя Штаты Амерыкі (ЗША). Яны складаюцца з 50 штатаў і адной федэральнай акругі.

Настаўнік задае вучням пытанні:

– Які мараплавацель адкрыў Амерыку?

– Ці зразумеў ён, што адкрыў мацярык?

– Хто з'яўляецца карэннымі жыхарамі Амерыкі?

– Якія плямёны былі самымі развітымі?

– Якія расліны прыйшлі да нас, дзякуючы ацтэкам?

– Пералічыце новыя словы, якія вы сёння пачулі, і растлумачце іх значэнне.

***Заданне 1*** (с. 24). Вучні чытаюць у рабочым сшытку вершы Міхася Пазнякова «Іглу» і «Вігвам» у парах і рыхтуюцца да выразнага чытання.

# Я – ЧАЛАВЕК

## *Тэма 18.* Чалавек і яго пачуцці: радасць, любоў

***Мэты:*** ствараць умовы для ўсведамлення сэнсу паняццяў «радасць», «любоў»; папаўняць слоўнікавы запас вучняў; вучыць аналізаваць прыказкі, бачыць і заўважаць радасныя моманты жыцця; развіваць памяць, мысленне; выхоўваць любоў да блізкіх людзей, Радзімы.

### Ход занятку

**I. Арганізацыйны этап**

Настаўнік стварае пазітыўны настрой з дапамогай вывучанай вершаванкі.

Вось званок звініць заўзята,
Кліча дзетак на занняткі,
На занняткі пазітыўныя,
Не звычайныя, а факультатыўныя.

**II. Этап падрыхтоўкі да актыўнага і свядомага засваення ведаў**

Паведамляецца, што сёння пачынаецца вывучэнне новага раздзела «Я – чалавек». У гэтым раздзеле гутарка пойдзе пра пачуцці, якасці чалавека, пра блізкіх людзей, дасягненні людзей у розных справах, прафесіях, знакамітых людзей свету.

**III. Этап засваення новых ведаў**

Прапануецца прачытаць тэму занятку, запісаную на дошцы.

*Слова настаўніка*

Чалавек – гэта цэлы свет пачуццяў.

**Пачуцце** – гэта тое, як чалавек ставіцца да людзей і іх учынкаў, да розных з'яў, да самога сябе.

Кароткачасовыя перажыванні людзей называюць **эмоцыямі**: радасць, смутак, задаволенасць. Ёсць пачуцці, якія з чалавекам на ўсё жыццё: напрыклад, любоў, прывязанасць да блізкіх людзей.

Кожны чалавек па-свойму ўспрымае жыццё. Усё, што адбываецца вакол, выклікае ў нас нейкія адчуванні: мы радуемся ці сумуем, весялімся ці плачам, цікавімся ці застаемся раўнадушнымі, асуджаем ці згаджемся.

– Што можа выклікаць ў вас радасць?

– Калі вы ў гэтым годзе адчувалі радасць?

– Ці можаце вы даць азначэнне гэтаму слову?

А потым настаўнік тлумачыць новыя значэнні вядомага слова.